# З успамінаў Я.Я.Сусько

У кастрычніку 1942 г. я разам з невялікай групай лётчыкаў-інструктараў быў накіраваны ў вучэбны цэнтр для авалодання новымі самалётамі. За кароткі час мы асвоілі пілатаванне самалёта Іл-2. Па тым часе гэта быў добры самалёт, меў хуткасць 450 км у гадзіну і магутнае ўзбраенне (2 кулямёты, 2 гарматы, 6—8 рэактыўных снарадаў і мог несці да 500 кг бомб). Немцы называлі гэты самалёт «чорнай смерцю», таму што лётчыкі, дзейнічаючы на малой вышыні, наносілі вялікія страты ў яго жывой сіле і тэхніцы.

З сакавіка 1943 г. пачынаецца мой баявы шлях у складзе 996-га штурмавога палка 224-й штурмавой авіядывізіі. Помню першы вылет у якасці камандзіра звяна на разведку чыгуначнага вузла Спас-Дзяменск. У пары са сваім лётчыкам мы падышлі на вышыні 400 м да станцыі, дзе былі сканцэнтраваны чыгуначныя саставы з жывой сілай і тэхнікай, і абрушылі бомбавы ўдар нечакана. Немцы адкрылі зенітны агонь толькі пасля таго, як бомбы трапілі ў цэль. На станцыі загарэліся цыстэрны з гаручым, пачаліся выбухі. Першы баявы поспех акрыліў нас, усяліў упэўненасць у нашай перамозе над ворагам.

У далейшым наш полк, дыслацыруючыся на розных аэрадромах, здзяйсняў баявыя дзеянні ў аператыўных тылах немцаў Бранскай, Смаленскай, Арлоўскай абласцей. У сакавіку—чэрвені 1943 г. вялікімі і малымі групамі наносілі ўдары па аэрадромах, чыгуначных станцыях і праціўніку. Мне асабіста прыйшлося ў складзе груп штурмаваць аэрадром «Сешча», чыгуначныя станцыі Людзінава, Жукава і інш. Гэтыя цэлі былі непадалёку ад Хоцімска, і гэта натхняла мяне. Я з вялікім жаданнем ішоў на выкананне заданняў камандавання. Нельга зараз выказаць у словах пачуццё радасці, якое ўзнікала ў палёце пасля паспяховага баявога задання, бо да маіх родных мясцін быў невялікі час палёту, дзе мая маці, сястра і малодшыя браты заставаліся ў акупацыі ў вёсцы.

1—2 мая 1943 г. нам было загадана вялікай групай у складзе 24 самалётаў пад прыкрыццём знішчальнікаў ліквідаваць аэрадром «Сешча», дзе, па дадзеных разведкі, было сканцэнтравана каля 200 самалётаў немцаў. Немцы з гэтага аэрадрома наносілі начныя ўдары па нашых тылах.

1 мая 1943 г. на досвітку наша група ў складзе 6 самалётаў нанесла першы нечаканы ным. Бо ў той час у нас не было радыё, кіно, тэлевізараў, нават тэлефон быў рэдкасцю. Упершыню я ўбачыў чыгунку, калі ехаў у Ленінград пасля заканчэння сямігадовай школы.

Ні ў Хоцімску, ні ў вёсках не было электрычнасці, мы займаліся дома пры святле лучыны або, у лепшым выпадку, пры святле лямпы. Мы імкнуліся вучыцца, авалодваць ведамі. Я ніколі не прапускаў заняткаў у школе і вучыўся старанна. Нават у самае дрэннае надвор'е зімой і вясной у час паводак я садзіўся верхам на шэрага каня і ехаў у школу за тры кіламетры, потым адпускаў каня дамоў і ён прыходзіў сам у вёску — гэта быў разумны конь.

І ўсё ж, нягледзячы на цяжкасці, я ўспамінаю аб сваім дзяцінстве часта і аб сваіх настаўніках з павагай.

Так склалася жыццё, што мне ўжо пасля вайны прыйшлося шмат вучыцца, каб атрымаць вышэйшую адукацыю. Дыпламатыя — гэта асаблівая прафесія. У агульных словах дыпламатыя вызначаецца як сродак весці перагаворы. У дарэвалюцыйны час дыпламатыя была прывілеяй дзяцей багатых, рабочаму або селяніну на гэту службу быў шлях закрыты. Толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі дзеці рабочых і сялян атрымалі магчымасць вучыцца і авалодваць ведамі, накопленымі чалавецтвам.

Дыпламатамі людзі не нараджаюцца. Для таго, каб выконваць абавязкі дыпламата, трэба быць высокаадукаваным, ведаць добра гісторыю, добра разбірацца ў палітыцы, ведаць хаця б адну-дзве замежныя мовы. Але і гэтага мала. Трэба быць адданым сваёй Радзіме. Дыпламат павінен умела абараняць інтарэсы сваёй краіны.

Мне давялося прыкладна 18 гадоў працаваць у пасольствах нашай краіны, у шэрагу дзяржаў: Югаславіі, Угандзе, Іраку, а таксама наведваць сталіцы краін Еўропы, Афрыкі, Блізкага Усходу, Азіі. Прыходзілася сустракацца з дзяржаўнымі дзеячамі, прэзідэнтамі і міністрамі многіх краін і нават сустракаць папу рымскага Паўла VI, які знаходзіўся з візітам у Угандзе. Урад у выпадку прыезду папы арганізаваў прыём, на які былі запрошаны главы дыпламатычных місій і пасольстваў, у тым ліку запрасілі і мяне. У час прыёму дыпламаты падыходзілі да папы, прадстаўляліся яму і цалавалі руку. Я падышоў да яго, прадставіўся і пацiснуў працягнутую руку. Папа

ўдар і вярнулася на свой аэрадром са стратай аднаго экіпажа. 2 мая група ў складзе 24 штурмавікоў нанесла другі ўдар па аэрадрому. Але цяпер немцы былі напагатове: яны папярэдне ўзнялі свае знішчальнікі і прывялі ў гатоўнасць сродкі агнявой аховы. Яшчэ пры падыходзе да цэлі нашы самалёты былі атакаваны нямецкімі знішчальнікамі. Поле аэрадрома было закрыта загараджальным зенітным агнём, але штурмавікі прарваліся да цэлі і скінулі свой бомбавы груз. Пры выхадзе з атакі аэрадрома, мой самалёт быў атакаваны двума «месерамі». З другога заходу доўгая чарга варожага знішчальніка прашыла праву частку хваста, фюзеляжа, была разварочана абшыўка на правым крыле. Самалёт пачаў завальвацца. Мне каштавала вялікіх намаганняў яго выраўняць. Справа ад мяне, літаральна за 15—20 м, прыладкаваўся немец, збавіў хуткасць, адкрыў шкло кабіны і, узняўшы ўказальны палец, правёў сабе рукой па горлу, маўляў, капут. Можна ўявіць маё становішча! І тым не менш на знакі немца я паказаў яму кулак. Я накіраваў самалёт у шырокую прасеку ў лесе, якая аказалася на шляху і літаральна нырнуў уніз. Мільганула думка пасадзіць самалёт, а самому са стралком шукаць партызан, якія ў такіх выпадках павінны былі выручаць лётчыкаў. Але стралок паведаміў, што немцаў не відаць. Магчыма, яны на паўторным заходзе выпусцілі з-пад увагі мой самалёт. Я развярнуў машыну курсам на ўсход і пайшоў на свой аэрадром. У час пасадкі самалёт разваліўся. Экіпаж абышоўся ўдарамі і сінякамі.

У пачатку 1944 г. полк і дывізія пачалі баявыя дзеянні на 1-м, а потым на 4-м Украінскім франтах. Я зрабіў 141 баявы эфектыўны вылет у якасці камандзіра эскадрыллі. Мой самалёт некалькі разоў збівалі, а мне ўдавалася прызямліцца на сваёй тэрыторыі. У паветраным баі быў паранены, але ўсё абышлося. Эскадрылля з лістапада 1943 г. па май 1945 г. здзейсніла 1418 баявых вылетаў.

Пасля дэмабілізацыі я прыбыў да сям'і ў Варонеж. Імкненне да вучобы і ведаў было непераадольнай сілай і, нягледзячы на цяжкасці тых гадоў, мне ўдалося атрымаць вышэйшую адукацыю і выконваць у далейшым важныя даручэнні партыі і ўрада.

Успамінаючы свае дзіцячыя гады і сваю вучобу ў Хоцімскай сямігадовай школе, я ў думках быццам бы зноў сяджу за партай і слухаю сваіх настаўнікаў. У той час мы былі іншымі — сялянскімі дзецьмі, прыходзілі ў школу з акружаючых Хоцімск вёсак: Чарняўкі, Янаўкі, Узлог, Ліпаўкі, Варвараўкі, Бяседавіч. Мы былі дрэнна апрануты і абуты, і не заўсёды накормлены, мы вельмі мала ведалі аб свеце, у якім жылі, аб сваёй краіне. Наша кола інтарэсаў і ведаў было вельмі абмежавана не выказаў і не паказаў сваёй незадаволенасці. Ён нават пажадаў мне поспеху, а я ў сваю чаргу пажадаў яму здароўя і паспяховага завяршэння візіту.

Нашым дыпламатам часта даводзілася працаваць за мяжой у складанай і нават варожай абстаноўцы, але даручэнні свайго ўрада яны выконвалі дакладна.

*Падрыхтавала да друку В.І.Баурына. Матэрыял захоўваецца ў музеі СШ № 1 Хоцімска.*

**З успамінаў Я. Я. Сусько** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Хоцімскага раёна / рэдкалегія: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2003. — С. 293—295.